● ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ

# «МНЕ СЛОВА МАТЧЫНА НЕ Ў ЛІШАК...»

Яшчэ ў 80-я гады мінулага стагоддзя народны паэт Беларусі Пімен Панчанка, заклапочаны зніжэннем грамадскага статусу і звужэннем сфер ужывання беларускай мовы, пісаў: «Дзе шукаць / Сваю родную мову / Ў наш час? / Адкажы мне пацiху, / Не голасна... / Недзе ёсць беларуская школа, / Недзе ёсць беларускі ў нас клас; / Ды тэатры Купалы і Коласа...» З часу напісання верша прайшло больш за тры дзесяцігоддзі, але сітуацыя мала ў чым змянілася.

Мова – гэта прадмет гонару кожнага народа. Родная мова з'яўляецца важным духоўным здабыткам кожнага этнасу, адной з найважнейшых прыкмет нацыі, выступае сродкам, з дапамогай якога мы далучаемся да сваіх продкаў і нашчадкаў. Сёння кожнаму з нас трэба смялей ужываць беларускае слова не толькі ў побытавай сферы і паўсядзённых зносінах, але і пры выкананні сваіх службовых абавязкаў, на працы, у школе, памятаць пра тое, што беларуская мова – гэта дзяржаўная мова Рэспублікі Беларусь, тытульная мова беларускага этнасу.

Родная мова – гэта адзін са сродкаў фарміравання асобы і яе паўнавартаснага выхавання. Для таго, каб маладыя людзі з павагай ставіліся да гістарычнага мінулага нашай Радзімы, яе традыцыйнай народнай культуры, неабходна выхоўваць у іх любоў да роднай мовы як нацыянальнай святыні. Гэта можна паспяхова ажыццяўляць у працэсе арганізацыі вучнёўскай і студэнцкай навукова-даследчай працы.

У гімназіі № 7 г. Віцебска ўжо шмат гадоў на ніве служэння роднаму слову працуе настаўніца, выпускніца нашага ўніверсітэта Алена Фёдараўна Сімакова, гадаванцы якой неаднаразова станавіліся ўдзельнікамі і пераможцамі Рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры. У гэтым годзе пад яе кіраўніцтвам вучні шчыруюць над навукова-даследчай працай на тэму: «Мне слова матчына не ў лішак...»: родная мова праз прызму беларускай літаратурнай афарыстыкі» (навуковы кансультант – дацэнт А.С. Дзядова). Несумненна, вынікі, атрыманыя ў працэсе даследавання, будуць паспяхова выкарыстаны не толькі ў адукацыйным і выхаваўчым працэсе, але і ў плане папулярызацыі і пашырэння беларускай мовы.

Любіце, паважайце і цаніце сваё роднае, матчына беларускае слова. У ім – наша беларускасць, нашы вытокі і карані! Памятайце, што мова – гэта жывая з'ява. Яна «прырастае» і «прарастае» там, дзе крынічыць людское жаданне.

**Алена ДЗЯДОВА,**
**дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства,**
**Вераніка ШАБЕКА,**
**вучаніца 9 «А» класа гімназіі № 7 г. Віцебска.**

● НА ФФКиС

# ПОМОГАЮТ СТАТЬ НА ПУТЬ ИСПРАВЛЕНИЯ



В этом учебному году на базе факультета физической культуры и спорта нашего университета проходят тренировки и соревнования по мини-футболу среди детей и подростков, с которыми проводится индивидуальная профилактическая работа «На пути к успеху». Занятия организованы при поддержке управления правопорядка и профилактики милиции общественной безопасности управления внутренних дел Витебского областного комитета.

Недавно на ФФКиС прошел турнир по мини-футболу среди детей и подростков. Главным судьей соревнований стал доцент кафедры спортивно-педагогических дисциплин Вадим Аркадьевич Хлопцев. Команда-победитель получила путевку на международные состязания, которые пройдут в Пскове.

– Для многих школьников знакомство с нашим факультетом и университетом начинается с тренировок, которые они посещают в рамках индивидуальной профилактической работы «На пути к успеху». На таких занятиях наши студенты делятся с ребятами своим опытом, обучают их всему, что умеют сами, – отметил декан ФФКиС Денис Эдуардович Шкирьянов.

– Главная цель тренировок, которые проходят на факультете физической культуры и спорта – организация внеурочной досуговой занятости подростков. Установлено, что чаще всего подростки совершают правонарушения и преступления в вечернее либо ночное время. Как правило, это происходит из-за того, что после учебы школьники ничем не заняты и предоставлены сами себе. Именно для таких ребят мы организуем занятия и на собственном примере показываем, насколько важны физические тренировки. Мы проводим соревнования со студентами, у которых уровень игры в футбол намного выше, и учащиеся с них берут пример. Это европейская система обучения: равный обучает равного. К слову, в последнее время в Витебской области количество совершенных детьми и подростками преступлений снизилось, – рассказал Роман Викторович Бардеев, старший инспектор по особым поручениям группы организации работы инспекции по делам несовершеннолетних отдела правопорядка управления правопорядка и профилактики милиции общественной безопасности управления внутренних дел Витебского областного комитета, майор милиции.

Давид Шиленков, ученик 11 класса средней школы № 14 г. Витебска:

«Я очень люблю футбол, потому что это быстрая и тактически сложная игра, взаимодействие с командой и стремительное принятие решений. Занятия по футболу дарят массу положительных эмоций, драйва и адреналина. Планирую поступать в ВГУ имени П.М. Машерова на факультет физической культуры и спорта, ведь активное занятие спортом – это всегда здорово. В будущем хочу заниматься легкой атлетикой».

**Алеся МЯДИЛЬ.**

